# На палетках – умелыя сейбіты з ААТ «Агранёманскі»

**У ліку першых прыступілі да сяўбы ранніх яравых збожжавых хлебаробы ААТ «Агранёманскі».**



*Вядзецца сяўба ранніх яравых збожжавых*

Камбінаваны пасяўны агрэгат HORSCH вывеў на 90-гектарнае поле за вёскай Залужжа вопытны сейбіт таварыства **Дзмітрый Сагайдакевіч,** які бывае задзейнічаны на розных палявых работах і ўсе даручаныя заданні выконвае своечасова і якасна.

– Гэты ўчастак засеем аўсом сорту «шанс», набылі гадавальнік размножвання, – гаворыць галоўны аграном таварыства **Іван Скварчэўскі.** – З’яўляемся элітгасам, таму закупілі і пэўную колькасць насення высокіх рэпрадукцый новых перспектыўных сартоў: ячменю «колдун» і «добрый», гароху «презент», а таксама гадавальнікі размножвання грэчкі «альфа» і проса

«галинка».



*Не займаць старання Аляксандру Пухоўскаму*

Усяго пад раннія яравыя збожжавыя і зернебабовыя культуры ў таварыстве адвялі сёлета 1050 гектараў. Плануюць справіцца з сяўбой ранніх яравых культур у самыя сціслыя тэрміны. Падключаць на наступным тыдні яшчэ адзін камбінаваны пасяўны агрэгат, з якім працуе **Аляксандр Ханчэўскі.**

Усе палявыя работы ў таварыстве вядуцца ў комплексе. Калектыў механізатараў дружны і працавіты. На падрыхтоўцы глебы пад яравую сяўбу заняты **Віктар Семянько, Арцём Дарашэвіч** і **Дзмітрый Шышко.** Найпершы клопат у агранамічнай службы і пра азімыя культуры. Вядзецца іх падкормка азотнымі ўгнаеннямі. Завіхаюцца **Аляксандр Ветраў, Аляксей Пальчык** і **Уладзімір Астахновіч.**

Ля вёскі Дразды шчыраваў з пасяўным агрэгатам СПУ-6 механізатар **Аляксандр Пухоўскі** — высяваў травяныя сумесі, закладваючы шматкампанентную пашу для грамадскага статка.

Пад кукурузу ў гаспадарцы адведзена 1050 гектараў, пад цукровыя буракі – 350.

**Надзея БАТАЛКА, фота аўтара**